Tut.by

08.06.2018

# Малы Трасцянец: выстаўка-хроніка маштабнага злачынства




12+

- [Национальная библиотека Беларуси]
- [г. Минск, пр-т Независимости, 116]

## Расписание

С 7 июня по 31 января,
ПН–ПТ 10:00—21:00
СБ–ВС 10:00—18:00

7 чэрвеня 2018 года а 16-й гадзіне ў атрыуме 2-га паверха Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (пр. Незалежнасці, 116) **адкрыецца інфармацыйна-дакументальная выстаўка «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць».**

**Арганізатары** − Дортмундскі міжнародны адукацыйны цэнтр, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханэса Рау, фонд «Мемарыял памяці забітых яўрэяў Еўропы» і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Беларуска-нямецкі выставачны праект заклікае аддаць даніну памяці ахвярам Трасцянца і адначасова адлюстроўвае, якім чынам і дзе ў Беларусі, Германіі, Аўстрыі і Чэхіі захоўваецца памяць аб загінуўшых. Разам з гэтым, распавядае аб месцах масавага знішчэння і тых, хто здзяйсняў зверства.

Выстаўка складаецца з 18 раздзелаў, якія прадстаўляюць Малы Трасцянец як месца злачынства і месца памяці. Асобныя раздзелы прысвечаны ўрочышчу Благаўшчына, дзе адбываліся масавыя растрэлы, «Аперацыі 1005», забойству ў Шашкоўцы, дзе была пабудавана печ для знішчэння людзей. Асноўная ўвага нададзена біяграфічным партрэтам ахвяр Трасцянца.

**Наведаць інфармацыйна-дакументальную выстаўку «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць» магчыма да 31 студзеня 2019 года.**
**Дата завяршэння работы выстаўкі можа быць зменена!**

**Тэлефон для даведак: (+375 17) 266 37 37.**